**ПАЛІТЫКА ПРЫВАТНАСЦІ ФОНДА ГРАМАДЗЯНСКАГА РАЗВІЦЦЯ “NATION OF LEADERS”**

## Інфармацыйнае палажэнне пра апрацоўку персанальных дадзеных

1. Адміністратарам Вашых персанальных дадзеных з'яўляецца Фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders з юрыдычным адрасам у Варшаве (03-717), вул. Ігнацыя Клапатоўскага, 22, KRS: 0000914944 ("Фонд"); кантактавы адрас электроннай пошты: contact@nationofleaders.pl.
2. Мы атрымваем персанальныя дадзеныя наўпроста ад Вас, калі Вы запаўняеце форму, пададзеную на сайце. Мы апрацоўваем Вашы персанальныя дадзеныя, якія Вы падаяце ў форме.
3. Падставай для апрацоўкі Вашых персанальных дадзеных з'яўляецца дадзеная Вамі згода (арт. 6 п.1а RODO*). Вашы персанальныя дадзеныя будуць апрацоўвацца з мэтай, вынікаючых са зместу дадзенай Вамі згоды, а менавіта: будучы набор валанцёраў у Фонд, будучы набор супрацоўнікаў у Фонд на вакансіі (працаўладкаванне на падставе працоўных і грамадзянска-прававых дамоў), адпраўленне Вам паведамленняў пра пачатак рэгістрацыі на курсы, што праводзяцца Фондам, ці адпраўленне Вам рассылак Фонду пра запланаваныя адукацыйныя курсы, галасавыя чаты і гасцей на платформе. Калі апрацоўка Вашых персанальных дадзеных будзе ажыццяўляцца ў іншых мэтах, гэта будзе зроблена пры наяўнасці Вашай асабістай папярэдняй згоды на апрацоўку Вашых персанальных дадзеных у аб'ёме і для мэт, паказаных у такой згодзе (арт. 6 п.1а RODO).
4. Падаванне персанальных дадзеных з'яўляецца самаахвотным, але патрэбным для таго, каб, у залежнасці ад зместу дадзенай Вамі згоды, Вы маглі ўзяць удзел у будучым наборы валанцёраў ці супрацоўнікаў, якія праводзіцца Фондам, ці каб Вы маглі атрымваць паведамленні пра пачатак рэгістрацыі на курсы, што праводзяцца Фондам, ці інфармацыйны бюлетэнь Фонду. Вы маеце права ў кожны час адклікаць сваю згоду на апрацоўку Вашых персанальных дадзеных. Адкліканне згоды не ўплывае на юрыдычную правамернасць апрацоўкі, якая ажыццяўлялася да яго адклікання.
5. Працягласць апрацоўкі Вашых персанальных дадзеных залежыць ад мэты, для якой яны апрацоўваюцца. Калі Вы далі згоду на атрыманне паведамленняў пра пачатак рэгістрацыі на курсы Фонду ці рассыланне навін Фонду, Вашы персанальныя дадзеныя ў выглядзе адраса электроннай пошты будуць захоўвацца, пакуль Вы не паведаміце нас аб тым, што адклікалі сваю згоду на іх апрацоўку. У іншых выпадках, калі Вы не давалі сваёй згоды на атрыманне паведамленняў ці рассылкі Фонду, Вашы персанальныя дадзеныя будуць захоўвацца не больш за 10 гадоў з моманту падавання іх Фонду, калі Вы не адклікаеце сваёй згоды раней.
6. Вашы персанальныя дадзеныя могуць быць перададзены арганізацыям, што

супрацоўнічаюць з Фондам, у прыватнасці, дастаўнікам электроннай пошты, хостынгу і іншых IT-сістэм і паслуг, дастаўнікам сістэм і паслуг па падборы персаналу, дастаўнікам кансультацыйных паслуг.

**7.** Вашы персанальныя дадзеныя будуць перададзены на падставе дадзенай Вамі згоды (арт. 49 п. 1а RODO) кампаніі Formagrid Inc San Francisco (ЗША), якая кіруе платформай www.airtable.com, з дапамогай якой мы збіраем Вашы персанальныя дадзеныя і апрацоўваем іх для мэт, звязаных з іх кіраваннем для мэт, што выцякаюць са зместу дадзенай Вамі згоды, г. зн. для мэт: будучага набору валанцёраў і супрацоўнікаў Фонду (працаўладкаванне па працоўных і грамадзянска-прававых дамовах), адпраўленні паведамленняў пра пачатак рэгістрацыі на курсы, што праводзяцца Фондам, ці рассылкі навін Фонду пра запланаваныя адукацыйныя курсы, галасавыя чаты і гасцей на платформе. У ЗША не дзейнічае Агульны рэгламент па абароне дадзеных RODO, там няма кантрольнага органа, а Еўрапейская камісія не прыняла пастановы пра прызнанне ЗША краінай з належным узроўнем абароны дадзеных, і мы не падаём належных гарантый, як паказана ў арт. 46 RODO. Інфармацыю пра апрацоўку дадзеных кампаніяй Formagrid Inc можна знайсці ў яе Палітыцы прыватнасці https://www.airtable.com/company/privacy . Вашы персанальныя дадзеныя таксама могуць быць перададзены ў іншыя краіны за межамі Еўрапейскай эканамічнай зоны (ЕЭЗ) ці міжнародным арганізацыям. Перадача дадзеных будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з RODO. Мы загадзя паінфармуем Вас пра намер перадаць Вашы персанальныя дадзеныя.

**8.** Вашы персанальныя дадзеныя не будуць падпадаць пад аўтаматызаванае прыняцце вырашэнняў, уключаючы прафіляванне.

**9.** Вы маеце права ў кожны час запытаць доступ да сваіх персанальных дадзеных і атрымаць іх копію, права на выпраўленне, выдаленне, абмежаванне апрацоўкі, пераноснасць дадзеных і адкліканне сваёй згоды ў кожны час. Вы маеце права падаць скаргу ў наглядны орган, калі лічыце, што апрацоўка Вашых персанальных дадзеных парушае палажэнні RODO (у Польшчы такім органам з'яўляецца Старшыня Кіравання па абароне персанальных дадзеных https://uodo.gov.pl/pl/83/155).

* RODO - Рэгламент (ЕЗ) 2016/679 Еўрапейскага парламента і Рады ад 27 красавіка 2016 года пра абарону фізічных асоб у дачыненні да апрацоўкі персанальных дадзеных і пра вольнае перасоўванне такіх дадзеных і скасаванню Дырэктывы 95/46/ЕС (Агульны рэгламент па абароне дадзеных).